ROCZNIKI HUMANISTYCZNE
Tom LIII, zeszyt 7 – 2005

ЗОСЯ ТЫЧЫНА

# ПАЭТЫКА НОЧЫ, ЗІМЫ І СНУ Ў *ШЛЯХЦІЦЫ ЗАВАЛЬНІ* Я. БАРШЧЭЎСКАГА

Ноч, паводле тлумачальнага слоўніка беларускай мовы, –
гэта частка сутак ад заходу да ўсходу сонца, з вечара да раніцы[1].

Ноч мае здольнасць прымаць розныя аблічча: яна бывае белай, нібы дзень, і чорнай, як чарніла. Яна зорная альбо хмарная. Яна часам цёплая, а часам халодная. Ёсць палярная ноч, якая можа расцягвацца ажно да 176 сутак. Навальнічная, жудасна прыгожая, рабінавая ноч, калі бесперапынна ўспыхваюць зарніцы альбо лье дождж, зіхцяць бліскавіцы і грыміць гром, міжволі наводзіць на думкі пра пачатак Апакаліпсісу:

> О, які страх наводзіць такая рабінавая ноч на люд беларускі! У тую пару, калі на палетках даспявае ўраджай, яна, як найстрашнейшы непрыяцель, пагражае знішчыць усе надзеі земляробаў. Сустракае яе селянін, узносячы вочы да неба, з пацерамі на вуснах і з благаннем касцельных званоў[2].

Самая кароткая – вераб'іная ноч. А самая страшная, самая пачварная – варфаламееўская. Ноч духаў – Купальская ноч:

> Ноч Купалы ў тым баку Беларусі поўная незвычайных здарэнняў. На думку простага народа, уся прырода ў гэтую ноч весяліцца. Рыбакі бачаць азёрнае люстра, якое часам раскашуе ў месяцовым ззянні, і хоць неба яснае і паветра спакойнае, бліскучыя хвалі,

---

ЗОСЯ ТЫЧЫНА – аспірант Кафедры Гісторыі Беларускай Літаратуры Беларускага Дзяржаўнага Універсітэта (Мінск). Адрас для карэспандэнцыі: ул. К. Маркса 6-30, 220 050, Мінск, Беларусь. e-mail: zaveja@tut.by

[1] *Тлумачальны слоўнік беларускай мовы*. т. III, Мінск 1979, с. 416.

[2] Я. Баршчэўскі, *Успаміны пра наведванне роднага краю*, у: *Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях, Выбраныя творы*, Мінск 1998, с. 137-138. Далей спасылкі на гэтае выданне даюцца ў тэксце.

удараючы ў берагі, разбіваюцца на кроплі, якія, нібы зоркі, свецяцца ў паветры [87].

Не менш таямнічая і Навагодняя ноч, якая, адмяжоўваючы адзін год ад іншага, дае людзям спадзяванні на змену ў іх лёсе да лепшага: „Самая поўнач, прыйшоў Новы год, страчайма госця. Але якімі навінамі ён нас пацешыць?” [243]

Ноч збаўлення, выратавання і перамогі над злом – Вялікодная. Ноч – гэта сон для адных і бяссонне для іншых, гэта асаблівая атмасфера. Таму паэтызацыя начнога свету з яго цішынёй, своеасаблівымі боствамі, магіяй, трансфармацыямі і сненнямі заўсёды прысутнічала ў рамантычных творах. Даволі цяжка ўявіць дзённыя фантастычныя прыгоды Шчаўкунка і Мары Штальбаўм з вядомай казкі Э.Т.А. Гофмана, бо днём галоўны герой – усяго толькі пацешная цацка, а гераіня – толькі маленькая сямігадовая дзяўчынка. Чары ночы пануюць ў баладах Адама Міцкевіча, бо якім бы ні было надзвычайна прыгожым наваколле днём, менавіта ноччу яно набывае адзнаку цуду, які і жахае, і ўражвае, і захапляе. Гэта ўначы можна прагуляцца пешкі па зорнаму небу. І не толькі ў сненнях і марах:

А здарыцца быць тут начною парою,
Застынеш, аддаўшыся чарам:
Рой зор над табою, рой зор пад табою
І месяцы два перад тварам! [...]

Не можаш адрозніць у срэбным сутонні
Дно возера ўжо ад зеніту.
Як быццам вісіш ты ў нябесным бяздонні,
У нейкім разліве блакіту[3].

Моцная знітаванасць начнога фантастычнага свету з дзівоснай краінай казак і сноў выяўляецца ў празаічных і паэтычных творах Яна Баршчэўскага. *„Шляхціца Завальню, альбо Беларусь у фантастычных апавяданнях”* можна параўнаць з самай працяглай палярнай ноччу, паколькі менавіта цёмная частка сутак знаходзіцца ў цэнтры ўвагі аўтара. Як вядома з тэксту, галоўны герой, вакол якога развіваюцца падзеі, спадар Завальня, меў вялікую цікавасць да ўсяго незвычайнага, а таму „кожную ноч ён засынаў не іначай, як слухаючы чарадзейныя гісторыі”[89-90], пераказу якіх прысвечана значная частка твора. Пра дзённыя справы і клопаты гаспадара сядзібы,

[3] А. Міцкевіч, *Свіцязь, Вершы і паэмы*, Мінск 2000, с. 27.

што размясцілася на беразе возера Нешчарда, у творы апавядаецца мала[4]. Нам болей вядома пра яго начныя звычкі. Напрыклад тое, што ў зімовыя вечары ён ставіў на вакно свечку, каб падарожныя, якія заблукалі, змаглі знайсці шлях да яго жылля, дзе іх чакалі прытулак, гасцінны прыём і адпачынак. Што перад сном яму хто-небудзь з гасцей альбо служкаў абавязкова мусіў распавесці якую-небудзь гісторыю. Што пачасту, заслухаўшыся, шляхціц Завальня клаўся толькі пасля першага пеўня, але ўставаў тым не меней рана, паколькі быў перакананы, што сон ажно да абеду – прывілея паноў і лайдакоў. Што яго вочы зліпаліся ад „вучоных" гісторый пра прыгоды Адысея, але яго душу моцна кранапі простанародныя аповесці, якія ён любіў не толькі слухаць, але і абмяркоўваць, бо, відавочна, лічыў, што іх мудрасць і навука нашмат болей карысная, чым тая, якая змяшчаецца ва ўсялякіх школьных кніжках.

Расказванне казак на ноч (а дакладней – на сон), вядома, не з'яўляецца традыцыяй выключна дома шляхціца Завальні. Чароўнымі гісторыямі перад сном забаўляліся і забаўляюцца дзеткі розных краёў, а ў дарослых на глыбокую ноч знойдуцца свае не меней незвычайныя аповеды. Днём, калі з усіх бакоў навальваюцца ўсялякія клопаты не так лёгка адарвацца ад рэчаіснасці, паглыбіцца ў ірэальны свет казак, а значыць яны не будуць успрынятыя належным чынам. Пры дзённым святле гнілая калода ў лесе ўжо не будзе здавацца пачварай (альбо лавай у чарадзейным доме, дзе балююць дзівосныя госці, для якіх усю ноч іграў дудар Ахрэм у апавяданні пятым *Радзімы знак на вуснах*), а казачны цмок – страшным і непераможным. Днём няма калі думаць над багатай семіятычнай сістэмай, якую ўяўляюць сабой казачныя вобразы. А вось час перад сном і сненні дазваляюць разабрацца ў сэнсавых тонкасцях і рэальных, і фантастычных падзей.

Уночы болей верыцца ў існаванне духаў і нячыстай сілы, што звязана з дзвюма асаблівасцямі гэтага часу: са знікненнем сонца, а значыць прыходам цемры, і з панаваннем сну. Міфалагічная свядомасць асацыюе замену дзённага святла начной цемрай з часовай перамогай зла над дабром, смерці над жыццём, калі ўсё існае змяняецца настолькі, што яго немагчыма пазнаць (у цемры чалавек часткова пазбаўляецца зроку, які дае яму болей за

[4] Дню ў творы наогул мала адведзена месца, і калі мы чытаем, што паднялася сонца, то пачасту літаральна праз колькі радкоў ці абзацаў ужо сустракаюцца сказы, якія сігналізуюць пра наступленне ночы (гэта слушна асабліва ў дачыненні да тых частак твора, дзе гутарка ідзе пра пана Завальню): „сонца схавалася за лес, звечарэла" [196], „ужо пацямнела ў пакоі" [176] і г.д.

80% інфармацыі пра наваколле, а значыць становіцца болей прыступным і безабаронным перад небяспекай, якую ў цемры можа ўяўляць нават звычайная рэч, выпадкова пакінутая на дарозе), калі адкрываецца шлях у іншасвет і нядобрыя сілы набываюць магчымасць шкодзіць людзям. Суткі – маленькія ўзоры гэтага сусветнага змагання, перамога ў якім пераходзіць то да зла, то да дабра. Вялікая ж вайна адбываецца кожны год: цемра наступае на святло зімой (такім чынам, агеньчык свечкі, якую запальвае для вандроўнікаў шляхціц Завальня, бачыцца не толькі як праява сапраўднай хрысціянскай спагады, але і як маленькая дапамога сілам святла ў часіну панавання цемры[5]) і наадварот здае свае пазіцыі летам.

Змены, якія адбываюцца з прыродаю зімой, у мове найчасцей абазначаюцца з дапамогай лексемы „сон", што выяўляецца і ў творы Я. Баршчэўскага: „Заснула возера пад тоўстай лядовай глыбай, пасыпаўся снег з аблокаў – і ўжо зіма" [92].

Спяць аснежаныя дрэвы, задрамалі сном смерці кветкі і трава. Сон, паводле даследаванняў М. І. Талстога, у народным уяўленні пачасту звязваецца са смерцю, бо смерць „не з'яўляецца канцом жыцця, а толькі пераходам яе ў іншы стан, так і сон ёсць часовы пераход у іншы стан, у „паралельнае" жыццё; сон – свайго роду «абміранне»"[6].

Такім чынам, падабенства сну і смерці робіць магчымай замену слова з негатыўнай канатацыяй „смерць" на слова з больш прыймальнай афарбоўкай – сон. Стары Гараська, галоўны герой дванаццатага апавядання „*Стогадавы стары і чорны госць*", жадаючы паведаміць знаёмым пра свой блізкі канец і гатоўнасць да яго, выкарыстоўвае менавіта „мяккае" слова сон: „Збудаваў сабе дамок без дзвярэй і без вокан. Тут адпачну спакойна, сон мой не перапыніць ні смутак, ні трывога, ні клопаты" [262]. Зіма асацыюецца са смяротным сном, а таксама з холадам: „Знайшлі яго труп; сканаў, седзячы на крэсле. Рукі і ногі здранцвелі, нібыта ад моцнага зімовага марозу" [194].

Зіма, аднак, ці не самы любімы час шляхціца Завальні – як толькі замярзае Нешчарда, паўз фальварак па возеры пракладваецца вялікі шлях, а тады з'яўляецца шмат гасцей, а з імі – новыя гісторыі. Мяркуючы па тым,

---

[5] Зыркая свечка сімвалізуе святло і чысціню, а цьмяная – грэх і няшчасце. На вяселлі Карпы, які прадаў душу нячысціку, „свечкі ў маладых гарэлі так цьмяна, што сёй-той са страхам паглядаў на гэта, шэпчучы суседу: „Не будзе тут шчасця. Жыццё іх заціміцца смуткам" [100].

[6] Н. И. Т о л с т о й , *Славянские народные толкования снов и их мифологическая основа*, у: *Сон – семиотическое окно*, Москва 1993, с. 91.

што ўласны пляменнік Ян, які праводзіў у шляхціца колькі часу, штовечаровы аповед казак лічыў у цяжар[7], то служкам, якія нікуды ніколі не з'язджалі, мусіць, таксама было шмат радасці, што іх абавязак расказчыкаў бралі на сябе госці.

Ян Баршчэўскі, на нашую думку, свядома абірае менавіта халодную частку года для апісання, бо ночы ў гэты час даўжэйшыя, а людзі меней занятыя гаспадарчымі клопатамі, а таму меней спяшаюцца па сваіх справах і маюць болей часу на расповеды. Доўгія ночы – доўгі сон. Зімовымі вечарамі, калі завіруха стукае ў дзверы і здаецца, што ўся моц пекла вылезла на зямлю, вельмі прыемна драмаць ці сядзець у цяпле і гутарыць на разнастайныя тэмы. У *Шляхціцы Завальні* ў некаторых раздзелах выразна праступае кантраст паміж тым, што дзеецца на вуліцы, і тым, якая атмасфера ўладарыць у гасціннай хаціне Завальні. Сам гаспадар кажа пра свой дом: „Маё жытло – гэта порт на беразе мора; мушу кожную буру такім чынам ратаваць ад няшчасця падарожных" [177].

Наогул ноч (асабліва зімовая ці восеньская) схіляе да гутарак і ўспамінаў:

> Калі прырода спіць пад снегам, вые паўночны вецер, мінаюць доўгія цёмныя ночы, тысячы агнёў палаюць у вокнах гмахаў, не перапыняецца вясёлае жыццё сталіцы, і я, самотны, люблю аддавацца марам, мая думка ляціць далёка, да радзімых ваколіц, выклікае з магіл паважаных старых, бачыць іх забавы і чуе размовы пра шчаслівыя часіны, пра залаты век, калі чалавек араў сваё поле, будаваў дом сабе і сваім дзецям" [199].

Успамінаць розныя выпадкі са свайго жыцця любяць усе, але лічыцца, што гэтым займаюцца болей людзі старога веку, якія шмат пабачылі і перажылі, якія не чакаюць нічога наперадзе, акрамя смерці, а таму перабіраюць у памяці сваё жыццё, каб упэўніцца ў тым, што яны годна і не дарма жылі на зямлі: „Старыя ўспаміналі мінулае, згадвалі пра будучае; нейкая надзея кволілася ў іх думках" [137].

Пра асацыятыўную сувязь паміж старасцю і заканчэннем дня сведчыць вядомая загадка сфінкса (Хто раніцой ходзіць на чатырох нагах, апоўдні на дзвюх, а вечарам на трох?), адказ на якую даў Эдып (чалавек – у дзяцінстве, сталасці і старасці). Калі старасць – гэта вечар, то смерць, відавочна, – ноч: „Хто з нас будзе так доўга жыць?! – сказаў Альберт. – Не затрымае чалавек заходу сонца, каб дзень падоўжыць, і весялосць не прыкліча, калі яна прэч

[7] Пра гэта сведчаць яго словы: „Мы з дзядзькам любілі часта наведваць тоні і глядзець на багаты ўлоў, а тут яшчэ і тая была карысць, што ён, прабыўшы цэлы дзень на марозе, хутка засынаў, і я вечарамі быў вольны" [92].

уцякае”[193].

Як суткі могуць служыць узорам чалавечага жыцця, гэтаксама і змена сезонаў можа быць суаднесенай з узроставымі зменамі: „вясна, лета і восень людскога жыцця маюць свае аздобы [183], увесну і ў летнюю спякоту мароз прабягаў па ўсіх яго жылах” [194] (г. зн., што Альберт увесь час знаходзіўся на стадыі глыбокае зімы – ён, жывы і малады, быў мёртвым):

> Вясна! Кароткі твой усмех, кароткі той павеў лагоднага ветрыку, нядоўга цешаць вока барвы садоў; вільготныя туманы засцелюць зямлю, паляцяць птушкі ў вырай, пачнецца вецер і разнясе жоўтую лістоту па могілках.... [199], напрыемнейшы ў жыцці чалавека час – вясна маладосці [141].

Зіма – старасць з яе згадкамі пра былое. Праз зімовыя „фантастычныя апавяданні” ў *Шляхціцы Завальні* ніткай праходзяць успаміны аўтара пра яго дзяцінства, юнацтва, сталасць – наогул пра жыццё – гэта дарагія аўтару ўспаміны, агляд, асэнсаванне свайго мінулага і сучаснага.

Узгадваць лепей за ўсё ў пэўным коле блізкіх людзей, бо заўсёды знойдзецца які-небудзь шкілет у шафе, якога, аднак, хочацца абмеркаваць. Таму ізноў жа лепшы час – ноч. Ноччу большасць людзей спіць і думаць не думае, што дзеецца, пра што гаворыцца ў гэткую пару ў суседа:

> А поўначы ў панскім пакоі гарэла святло, і ён там з чарнакніжнікам пастаянна быў нечым заняты; усе заснулі, і ціш панавала панадворку, над дахам панскага жылля сюды і туды снавалі кажаны і нейкія чорныя птушкі [95].

Сон – гэта паглыбленне чалавека ва ўласны свет, да якога няма доступу іншым, – так лічылі некаторыя філосафы (напрыклад, Геракліт). Іншыя (Сакрат, Платон) не адмаўлялі магчымасць пранікнення ў сон знешняга свету альбо багоў, якія гэткім чынам прарочылі і папярэджвалі пра небяспеку і г. д.

У народнай свядомасці сон звязаны з адкрыццём межаў паміж „тым” і „гэтым” светам. Гэтае народнае ўяўленне пра сон падтрымліваецца ў чацвёртым апавяданні *Шляхціца Завальні, Ваўкалак* у сненні Маркі, падчас якога ён дзівосным чынам перажывае новае нараджэнне. Перакінуты ў ваўкалака, раззлаваны на людзей, Марка ідзе на злачынства, якое, аднак, адкрывае яму вочы на ўласнае грахоўнае жыццё, што прыводзіць да пакаяння і выкуплення віны. Адмова ад зладзейскіх учынкаў прыносіць збаўленне – салодкі сон. Альбо салодкую смерць жывёльнага ў чалавеку. У сненні ваўкалаку Марку даруюцца грахі і ён вяртае сваё чалавечае аблічча, але ён не мае магчымасці пачаць новае жыццё, пра што ён сам кажа: „Памёр я для

свету"[127]. Даследчык Навум Перкін лічыць апісанне сну Маркі адным з самых удалых момантаў у творы, „узорам сапраўднага паэтычнага хараства"[8].

Хрысціянскае стаўленне да сноў можна абазначыць як няўпэўненасць і падазрэнне, паколькі сненні, пра што сведчыць Біблія, могуць быць Боскім словам, а могуць быць д'ябальскай спакусай. Святы Кіпрыян, напрыклад, лічыў, што сненне (ці начное бачанне) варта паставіць на адную прыступку з Боскім адкрыццём, паколькі абедзве гэтыя з'явы падараваныя Святым Духам. Аднак, ён тут жа кажа пра недахопы сну – калі людзі спяць, яны не могуць чытаць малітвы і клікаць да сябе Бога, а значыцца трэба пастуціцца такім цудоўным дарункам у імя сапраўднай веры і малітвы. Можна упэўніцца, што шляхціц Завальня – сапраўдны хрысціянін (што неаднаразова падкрэсліваецца Янам Баршчэўскім: „жыла ў яго хрысціянскім сэрцы любоў да бліжняга [93], для майго дзядзькі адзінай гісторыяй была Біблія"[90]), спіць не так і багата. Позна кладзецца і рана ўстае. Праўда, замест таго, каб доўга маліцца перад сном ці чытаць Біблію, ён забаўляецца нейкімі паганскімі аповедамі пра духаў, пра чары, пра антычных багоў, пра чарнакніжнікаў, якія падбухторваюць на падступны продаж душы людзей. Але ж высновы прынамсі, якія ён робіць з усяго расказанага, цалкам адпавядаюць мысленню добрага хрысціяніна:

> Вось да чаго даводзіць п'янства і зухаватасць бязбожная" [121], Заўсёды такая смерць тым людзям, – сказаў дзядзька, – што шукаюць шчасця на гэтым свеце, а пра будучае жыццё не дбаюць [195].

Супрацьпастаўленне сну і малітвы прасочваецца ў першым апавяданні *Пра чарнакніжніка і пра цмока, што вылупіўся з яйка, знесенага пеўнем.* Згаданы намі раней (у сувязі з цьмянымі свечкамі) несумленны Карпа пачынаў злавацца на сваю жонку, калі тая да позняга працавала або малілася (праца ў дадзеным выпадку выступае ў якасці своеасаблівай малітвы, бо чалавеку, які заняты гаспадаркай ці іншай такой працай, няма часу на грэх). Сон можа быць уздзеяннем падступных чараў д'ябла, што вынікае з апавядання пра Белую Сароку. Пан Скамароха спадзяецца на абарону свайго сабакі і сваіх лёкаяў, але глыбокі і цяжкі сон, нібы кайданы, не дае ім скрануцца з месца. І хоць служкі ў сненнях разумеюць, што адбываецца нешта кепскае, яны не могуць гэта прадухіліць. Зрэшты, пан Скамароха му-

---

[8] Н. Перкін, *Абсягі думкі: літаратурна-крытычныя артыкулы*, Мінск 1980, с. 223.

сіў сам паруніцца пра сваю душу – раз ён не спаў, значыцца, адпаведна святому Кіпрыяну, ён павінны быў маліцца. Цікава, што шчырай малітве і сумленнасці супярэчыць таксама і смех, пра што не раз кажа Ян Баршчэўскі:

> А цяпер у касцёле чуеш адны шэпты ды смех; здаецца, для таго толькі і прыйшлі, каб паказаць свае модныя ўборы [110], сонца смяецца там і енчыць нейкае страхоцце [149], на імшы паводзіў сябе нясціпла, смяшыў іншых [204], смяшылі адзін аднаго, успамінаючы недахопы і дзівацтвы сваіх знаёмых; здзекаваліся з усіх, не шануючы ні кабет, ні старых [221].

А цікава гэта таму, што сон са смехам таксама мала стасуецца.

> У сне, – лічыць Л.В. Карасёў, – мы робім крок назад – да той прыроднай стыхіі, якая нас нарадзіла: вось чаму тут мы і самі не рагочам, і не чуем рогату іншых. Прырода рэч сур'ёзная[9].

Паводле энцыклапедычнага слоўніка *Беларуская міфалогія,* ноччу, калі ўсе людзі павінныя спаць, забараняюцца шматлікія „жывыя" рэчы, у лік якіх уваходзіць і смех, бо гэты час – небяспечны час разгортвання іншасвету. Самім жа зданям (прынамсі, кепскім духам), відавочна, дазволена рагатаць, але робяць яны гэта вельмі непрыемна – іх рогат злы, падступны, як гучны смех у касцёле. Такім чынам, ноч – час панавання духаў, а не людзей. І сон можа выступаць у ролі абаронцаў людзей ад духаў, бо падчас сну час бяжыць незаўважна (нездарма нават у Яна Баршчэўскага можна сустрэць словы пра тое, што ўсё мінаецца „як сон кароткі [259] альбо як найпрыемнейшы сон" [316]) і ноч, самы небяспечны час, чалавек нават не адчувае – толькі сцямнела, усе леглі спаць, ажно падымацца трэба. Людзі спяць і не бачаць цмокаў, якія цягаюць сваім ліхадзеям-гаспадарам золата ў мяшках (а значыць у людзей добрых меней шанцаў паквапіцца на чужое багацце і меней жаданняў разбагацець, гэтаксама заклаўшы душу). Яны не бачаць зданяў, якія блукаюць па зямлі па начах, а гэта добра для іх жа спакою, бо пабачыўшы такія з'явы ды добра напалохаўшыся, можна лёгка звар'яцець. І так хапае страху па начах:

> На тварах ва ўсіх відаць была трывога; палахлівыя кабеты са слязьмі на вачах шапталі пацеры: ім думалася, што там кожны стрэл разлучае з жыццём некалькі дзесяткаў чалавек. Яны дрыжалі, нібы перад Страшным Судом, і тая бяссонная ноч прайшла ў размовах [137], Мінула поўнач, а пра сон ніхто і не думаў; уся сям'я, сабраўшыся

[9] Л. В. Карасев, *Метафизика сна,* у: *Сон – семиотическое окно,* Москва 1993, с. 137.

разам, пасылала небу малітвы [138]. Люд, дрыжучы, паглядаў угору, дзе ў хмарах, што дыміліся крывёю, змагаліся палкі конных і пешых волатаў, і нараз гэты прывід трываў на небе да ўзыходу сонца [200]. У вёсках апоўначы пад вокнамі некаторых хацін здараліся незвычайныя і страшныя цуды: сонных абуджаў моцны крык дзіцяці [...]. Такія выпадкі, часта паўтараючыся, даводзілі ўсіх да найвялікшае роспачы [200].

Праўда, у Яна Баршчэўскага духі часам не лічацца з дзённым часам і ўсё ж такі выходзяць са сваіх схованак у светлую частку сутак (асабліва любяць гэтым займацца нячысцікі, але сустракаюцца і лясуны, душа старога Гараські). Здані ў Яна Баршчэўскага да таго асмялелі, што, насуперак народным вераванням, яны з задавальненнем карыстаюцца здольнасцю жывых істотаў спаць. Спіць на крэсле Плачка, дрэмле „ў чароўных малюнках будучыні" дух Фарон [240].

Застаецца толькі падзівіцца, што сон не дайшоў-ткі да нячысціка. І тое, мусіць, толькі таму, што ён увесь у клопатах, спрабуе перарабіць людзей і свет па свайму ўзору: „Не спіць злы дух, усюды шкодзіць людзям і заўсёды сябруе з тымі, хто забывае пра бліжніх сваіх. То кара Божая" [263].

Такім чынам, у творы Яна Баршчэўскага *Шляхціц Завальня, альбо Беларусь у фантастычных апавяданнях* ноч, зіма і іх верны служка сон займаюць пачэснае месца. Адназначна сказаць, што яны тут маюць выключна негатыўнае значэнне нельга, бо хоць зіма і ноч звязваюцца з холадам, княжаннем кепскіх сілаў, знікненнем святла і усталяваннем улады цемры, а сон – са смерцю і злым насланнём, усе тры з'явы абавязкова прыводзяць чытача да думкі пра прыгажосць і таямнічасць свету, а таксама пра абавязковы надыход справядлівасці, святла і шчасця. Акрамя таго: калі б не было доўгіх зімовых начэй і сну, то калі б пан Завальня пачуў бы гэтулькі гісторый? Мусіць, спагадлівы і лагодны сэрцам гаспадар сядзібы ля возера Нешчарда заўсёды з нецярплівасцю чакаў менавіта зімнюю ноч з яе жудасным надвор'ем. Ён сам на словы арганістага Андрэя пра зыркі ліхтар на доме, прывешаны ў якасці маяка для падарожных, адказаў:

У той толькі час і госці ў мяне, калі пакрые Нешчарду лёдам, але за гэта вясной і летам жыву, нібы пустэльнік які, акружаны вадою і лесам [181].

## БІБЛІЯГРАФІЯ

Баршчэўскі Я., Выбраныя творы, Мінск 1998.

Валодзіна Т., Ноч, у: Беларуская міфалогія: Энцыклапед. слоўн., Мінск 2004.

Карасев Л. В., Метафизика сна, у: Сон – семиотическое окно. XXVI-е Випперовские чтения, Москва 1993.

Міцкевіч А., Вершы і паэмы, Мінск 2000.

Перкін Н., Абсягі думкі: Літ.-крытыч. артыкулы, Мінск 1980.

Тлумачальны слоўнік беларускай мовы, т. III, Мінск 1979.

Толстой Н. И., Славянские народные толкования снов и их мифологическая основа, у: Сон – семиотическое окно. XXVI-е Випперовские чтения, Москва 1993.

## POETYKA NOCY, ZIMY I SNU W *SZLACHCICU ZAWALNI* JANA BARSZCZEWSKIEGO

### Streszczenie

Artykuł poświęcony został twórczości Jana Barszczewskiego, jednego z najbardziej znanych i cenionych na Białorusi pisarzy wieku XIX. Autorkę interesuje nie tyle rola Jana Barszczewskiego w rozwoju literatury białoruskiej, nie tyle ogrom elementów mitologicznych, folklorystycznych i aluzji historycznych zawartych w tym utworze, ile rzeczywistość oniryczna, świat nocy i poetyzacja zimy, a więc kluczowe elementy *Szlachcica Zawalni,* stanowiące o oryginalności i walorach artystycznych analizowanego utworu .

*Streściła Zosia Tyczyna*

**Słowa kluczowe**: noc, zima, sen, śmierć, bajki, wspomnienie, ciemność.

**Ключевые слова**: ночь, зима, сон, привидение, смерть, сказки, воспоминание, темнота.

**Key words**: night, winter, dream, spirit, death, fairy tale, remembering, darkness.